11. Прения по указу 9 ноября 1906 года в Государственной думе. – СПб., 1911. – 76 с.
12. Земская жизнь // Земщина. – 1909. – 15 июня. – С. 4.
13. *Бородин, А. П.* Государственный совет и указ 9 ноября 1906 года (Из истории аграрной реформы Столыпина) / А. П. Бородин // Отечественная история. – 1994. – № 2. – С. 74–89.
14. Государственный Совет. Стенографические отчеты. 1909–1910 годы. Сессия V. Заседания 1–64 (10 октября 1909 г. – 17 июня 1910 г.). – СПб.: Государственная типография, 1910. – 4096 стлб.

**(Дата подачи: 26.02.2024 г.)**

*К. Д. Даўматовіч*
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск

*K. Daumatovich*
Belarusian State University, Minsk

**УДК 94(474/476 ВКЛ):930(4–11)«18/19»+328(474/476 ВКЛ)**

# ВЫВУЧЭННЕ ПАРЛАМЕНТАРЫЗМУ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА НА КАФЕДРЫ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ СТАРАЖЫТНАГА ЧАСУ І СЯРЭДНІХ ВЯКОЎ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА: ДА 30-ГАДОВАГА ЮБІЛЕЮ КАФЕДРЫ

# STUDYING PARLIAMENTARISM OF THE GRAND DUCHY OF LITHUANIA AT THE DEPARTMENT OF HISTORY OF BELARUS IN ANCIENT TIMES AND THE MIDDLE AGES OF THE BELARUSIAN STATE UNIVERSITY: TO THE 30TH ANNIVERSARY OF THE DEPARTMENT

*У артыкуле адзначаецца ўклад супрацоўнікаў кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў БДУ ў развіццё беларускай гістарыяграфіі за апошнія 30 год. Паказана роля першага загадчыка кафедры П. А. Лойкі ў складванні даследчага напрамку ў беларускай гістарычнай навуцы – гісторыі парламентарызму Вялікага Княства Літоўскага. Зроблена выснова аб афармленні і функцыянаванні персанальнай навуковай школы П. А. Лойкі. Таксама адзначана роля У. А. Падалінскага ў далейшай распрацоўцы праблематыкі парламентарызму Вялікага Княства Літоўскага.*

*Ключавыя словы: кафедра гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў; Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт; Вялікае Княства Літоўскае; парламентарызм; сойм; беларуская гістарыяграфія.*

*The article notes the influence of the staff of the Department of History of Belarus of Ancient and Middle Ages of BSU in the development of Belarusian historiography over the last 30 years. The role of the first head of the Department, P. A. Lojka, in the development of the research direction – the history of parliamentarism of the Grand Duchy of Lithuania is shown. A conclusion is made about the design and functioning of the personal scientific school*

*of P. A. Lojka. The role of U. A. Padalinski in the further development of the problems of parliamentarism of the Grand Duchy of Lithuania was also noted.*

*Keywords: Department of History of Belarus of Ancient Times and Middle Ages; Belarusian State University; Grand Duchy of Lithuania; parliamentarism; Sejm; Belarusian historiography.*

Вялікае Княства Літоўскае з'яўляецца неад'емнай часткай гісторыі Беларусі. Працяглы час ВКЛ было «падзелена» паміж гісторыяй Польшчы і гісторыяй Расіі і ўвогуле не ўяўлялася як гісторыя, якая можа быць належнай іншым нацыям. Нават калі ў канцы XIX – пачатку XX ст. сярод беларусаў адбываўся сапраўдны нацыянальны «рэнесанс», акадэмічная супольнасць не змяніла сваіх поглядаў. У пэўнай меры гэта звязана з тым, што ў Беларусі на той момант не існавала адукацыйных і навуковых цэнтраў. Быў зачынены Віленскі ўніверсітэт, а беларуская моладзь была вымушана атрымоўваць адукацыю па-за межамі Радзімы (у Маскве, Санкт-Пецярбургу, Кіеве і інш.). Аднак сітуацыя кардынальна змянілася ў канцы 1910-х – пачатку 1920-х гг., калі была аформлена беларуская дзяржаўнасць на сацыялістычнай аснове. У 1921 г. у Савецкай Беларусі была адкрыта першая класічная вышэйшая навучальная ўстанова – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. Тады ж навуковымі коламі былі зроблены першыя спробы стварэння нацыянальнага гістарычнага наратыву, арганічнай часткай якога была і гісторыя ВКЛ [1, с. 52–53; 2–4]. Аднак доўгі час, нават пасля адкрыцця ў 1934 г. гістарычнага факультэта, ва ўніверсітэце не існавала вузкаспецыялізаванай структуры, якая б займалася пытаннямі айчыннай ВКЛістыкі. У 1936 г. была створана кафедра гісторыі СССР і БССР. Ужо ў 1958 г. была вылучана кафедра гісторыі БССР, якая займела сваё праблемнае і храналагічнае поле – сацыяльная гісторыя ВКЛ XVII–XVIII стст.

Пасля афармлення незалежнасці Рэспублікі Беларусь у пачатку 1990-х гг. пытанні айчыннай гісторыі набылі яшчэ большую актуальнасць. Сталі даступны дасягненні замежнай медыявістыкі, а гісторыя ВКЛ стала асобным этапам айчыннай гісторыі [5]. Ва ўмовах навуковага плюралізму стала магчымым вывучэнне новых праблем, сярод якіх вылучыўся накірунак сацыяльна-палітычнай гісторыі Вялікага Княства. Усё гэта прывяло да таго, што ў 1994 г. на гістарычным факультэце БДУ на базе рэарганізаванай кафедры гісторыі БССР была створана кафедра гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў (далей – кафедра), якую ўзначаліў Павел Алегавіч Лойка. Больш за тое, планавалася адкрыць спецыялізацыю «Гісторыя Вялікага Княства Літоўскага». Варта адзначыць, што верхняя храналагічная мяжа кафедры дасягае канца XVIII ст. як сімбіёз марксісцкай перыядызацыі і новамоднай на той час ідэі «доўгага Сярэднявечча» Жака Ле Гофа. У 1990-я гг. на кафедры працавалі Аляксандр Пятровіч Ігнаценка, Уладзімір Пятровіч Емельянчык, Леанід Аляксандравіч Жылуновіч, Уладзімір Аркадзьевіч Сосна, Юрый Леанідавіч Казакоў і інш. [6, с. 197; 7, с. 422–423].

З 1990-х гг. супрацоўнікі кафедры прынялі ўдзел у стварэнні нацыянальнага гістарычнага наратыву Беларусі. Першая спроба была рэалізавана

ў выданні «Нарысы гісторыі Беларусі» ў дзвюх частках. Менавіта тады адбыліся першыя спробы распрацаваць «белыя плямы» беларускай гісторыі перыяду ВКЛ, якія закраналі ў асноўным палітычную тэматыку, у тым ліку і праблему парламентарызму.

У «Нарысах» П. А. Лойка пры разглядзе праблем Люблінскай уніі 1569 г. і палітычнага палажэння ВКЛ пасля яе заключэння закранаў шэраг парламентарскіх сюжэтаў («абозны сойм» 1562 г. пад Віцебскам, рэформы 1560-х гг., пасяджэнне Люблінскага сойма 1569 г.) [8, с. 132–137]. Акрамя гэтага, у «Нарысах» У. П. Емельянчык сумесна з П. А. Лойкам распрацавалі праблему палітычнага крызісу ў Рэчы Паспалітай. У гэтым кантэксце яны закраналі шэраг парламентарысцкіх сюжэтаў другой паловы XVII – XVIII ст., якія раскрываюць прычыны падзелаў дзяржавы Абодвух Народаў (права liberum veto, пастанова 1673 г. аб кожным трэцім пасяджэнні сойма ў межах ВКЛ, пытанні дысідэнтаў, спробы рэфармавання дзяржаўнага ладу ў 1764 і 1788–1792 гг., апошняе пасяджэнне сойма РП у 1793 г.) [9, с. 230–237]. Дадаткова У. П. Емельянчык у кнізе «Паланэз для касінераў: (З падзей паўстання 1794 г. пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі на Беларусі)» тэматыку парламентарызму закранаў у рэчышчы паўстання Т. Касцюшкі. Перш за ўсё акцэнт быў зроблены на пастановах Чатырохгадовага (Вялікага) сойма 1788–1792 і Гарадзенскага сойма 1793 гг., якія ў наступстве мелі ўплыў на падзеі 1794 г. [10, с. 4–10, 23–24, 34, 57, 84, 124, 126–127, 144–145, 156]. Дарэчы, гэта праца атрымала высокую ацэнку сярод калег [11].

Першыя спробы стварэння нацыянальнага гістарычнага наратыву ажыццяўляліся ў пэўным сэнсе ў «экстрэмальных» умовах, калі ад навуковага асяроддзя патрабавалася ў кароткі тэрмін напісаць гісторыю Беларусі. Таму шэраг праблем, у тым ліку парламентарызм ВКЛ, быў разгледжаны даволі агульна. Адсюль адразу паўстала патрэба ў дапрацоўцы нацыянальнай гісторыі ў 2000-х гг., тым больш што беларуская гістарыяграфія дадала распрацоўку многіх тэм з гісторыі ВКЛ. Тады быў рэалізаваны вялікі навуковы праект па стварэнні і выданні шасцітомнай «Гісторыі Беларусі», у напісанні якой актыўны ўдзел прынялі супрацоўнікі кафедры.

У «Гісторыі Беларусі» у 6 тамах (Т. 2: Беларусь у перыяд Вялікага Княства Літоўскага) П. А. Лойкам была вылучана асобная праблема органаў саслоўнага прадстаўніцтва і ўлады. У яе межах навуковец паказаў эвалюцыю соймавай практыкі ў ВКЛ. Адзначалася, што сойм з’явіўся ў канцы XV ст. (у выданні абдрукоўка «ў канцы XVI ст.») як неабходнасць пашырэння сацыяльнай апоры вярхоўнай улады Вялікага Княства. Быў акрэслены склад сойма, у які ўваходзілі паны радныя, службовыя асобы цэнтральнага і мясцовага дзяржаўнага апарату, а таксама шляхта ўсіх зямель княства. Вучоны абазначыў змены ў соймавым прадстаўніцтве, якія адбыліся ў 1512 і 1565 гг. Акрамя гэтага, П. А. Лойка паказаў геаграфію соймавых пасяджэнняў у ВКЛ, многія з якіх адбыліся ў беларускіх гарадах [12, с. 386–387].

Ужо ў наступным томе «Гісторыі Беларусі» (Т. 3: Беларусь у часы Рэчы Паспалітай) У. П. Емельянчык у межах шырокай тэмы палітычнага крызісу Рэчы Паспалітай вылучыў шэраг праблем, у тым ліку звязаных з гісторыяй парламентарызму. Так, навуковец у працэсе разгляду грамадзянскай вайны ў ВКЛ у канцы XVII – пачатку XVIII ст. закранаў пытанні права liberum veto і яго ўплыву на працу сойма, фарміравання магнацкіх груповак і кліентэльных адносін, ролі асобных пасяджэнняў соймаў падчас унутрыпалітычнага канфлікту [13]. Больш за тое, У. П. Емельянчык раскрыў тэму грамадска-палітычнага жыцця ў Рэчы Паспалітай у другой палове XVIII ст. У гэтым кантэксце была паказана роля асобных соймаў у працэсе дзяржаўных пераўтварэнняў на пачатку праўлення Станіслава Аўгуста Панятоўскага (напрыклад, соймы 1764 і 1766 гг.), а таксама роля дысідэнцкага пытання, якое стала першачарговым на сойме 1767–1768 гг. [14, с. 209–210]. Асобную ўвагу навуковец надаў дзейнасці Чатырохгадовага (Вялікага) сойма 1788–1792 гг. Былі паказаны этапы яго рэфарматарскай дзейнасці, апагеем якой з'ўлялася прыняцце Канстытуцыі 3 мая 1791 г. [14, с. 230–237]. У кантэксце першага і другога падзелаў Рэчы Паспалітай гісторык адзначыў соймы 1773–1775 і 1793 гг., якія юрыдычна аформілі тэрытарыяльныя і палітычныя змены ў дзяржаве [14, с. 227–229, 243–245]. Акрамя гэтага, У. П. Емельянчык удзельнічаў у міжнародных навуковых праектах, у якіх так ці інакш закраналася гісторыя парламентарызму ВКЛ [15].

Калі казаць пра персанальныя даследаванні, то трэнд на вывучэнне палітычнай гісторыі ВКЛ у Беларусі заклаў першы загадчык кафедры П. А. Лойка. Першапачаткова ён атаясамляўся як даследчык сацыяльна-эканамічнай гісторыі Вялікага Княства, праблематыка якой дамінавала ў савецкія часы, асабіста ў асяродках даследчыкаў эпохі феадалізму ў БДУ і Інстытуце гісторыі АН БССР. Найчасцей гэта тэматыка ў навуковым дыскурсе савецкай гістарыяграфіі прадстаўлялася ў дыхатаміі «сяляне vs шляхта». Аднак ва ўмовах 1990-х гг. П. А. Лойка сканцэнтраваўся на вывучэнні гісторыі беларускай шляхты, перш за ўсё ў парадыгме палітычнай гісторыі. Нават рыхтавалася доктарская дысертацыя, якая, на вялікі жаль, не дачакалася абароны – даследчык заўчасна сыйшоў з жыцця 22 кастрычніка 2010 г. [16, с. 114]. У межах гісторыі шляхты апошняй трэці XVI – першай трэці XVII ст. навукоўцам таксама была распрацавана сумежная тэматыка парламентарызму ВКЛ. Так, П. А. Лойкам разглядаліся пытанні гістарыяграфіі грамадска-палітычнага жыцця ў Рэчы Паспалітай, палітычнай думкі, функцыянавання соймікаў беларускіх зямель, афармлення такога соймавага стану, як шляхта ВКЛ, Люблінскага сойма 1569 г., ролі соймавай практыкі ў міжсаслоўных узаемадачыненнях і інш. [16–27].

Сапраўднай навацыяй для ўсёй беларускай гістарыяграфіі быў выхад у 2002 г. асобнай манаграфіі П. А. Лойкі «Шляхта беларускіх зямель у грамадска-палітычным жыцці Рэчы Паспалітай у другой палове XVI – першай трэці XVII ст.». Аўтар засяродзіў увагу на вырашэнні трох праблем:

стану беларускай шляхты ў далюблінскі перыяд, палітычных інтарэсаў і сацыяльнай актыўнасці шляхты беларускіх зямель у апошняй трэці XVI – першай трэці XVII ст., грамадска-палітычнай свядомасці беларускай шляхты. Тым не менш у гэтай працы навукоўцам выказваліся цікавыя назіранні наконт гісторыі парламентарызму. Пры гэтым найчасцей менавіта парламентарскія сюжэты выступалі галоўным інструментарыем у вырашэнні пастаўленых задач. Так, П. А. Лойка адносіў канчатковае афармленне сойма ВКЛ да канца XV ст. [28, с. 24–25]. Акрамя гэтага, было адзначана, што ў 1565 г. у Вялікім Княстве была створана парламенцкая сістэма (соймік – сойм) [28, с. 4, 26–27]. У кнізе П. А. Лойка разгледзеў працэс афармлення шляхецкага саслоўя ВКЛ і яго структуру як складаную частку прадстаўнічых інстытутаў улады [28, с. 8–29]. Сацыяльная актыўнасць шляхты гісторыку бачылася праз яе ўдзел у соймавых пасяджэннях ад лакальнага ўзроўню да агульнадзяржаўнага. Пры гэтым палітычныя інтарэсы шляхты беларускіх зямель былі самымі разнастайнымі і тычыліся пытанняў эканомікі, улады, права, рэлігіі, знешняй палітыкі і г. д. [28, с. 30–85]. Адносна грамадска-палітычнай свядомасці беларускай шляхты была зроблена выснова аб яе патрыятычным стаўленні да Айчыны [28, с. 86–94]. Варта адзначыць, што многія навуковыя тэзісы П. А. Лойкі фігуравалі ў шматлікіх абагульняючых працах, дапаможніках па гісторыі Беларусі для сярэдняй і вышэйшай школы, метадычнай літаратуры для настаўнікаў і г. д.

Асабістыя даследаванні П. А. Лойкі зрабілі моцную падставу для выкладчыцкай дзейнасці. Дзякуючы сімбіёзу навукі і выкладання на гістарычным факультэце БДУ П. А. Лойка здолеў стварыць персанальную навуковую школу па гісторыі ВКЛ. Пад яго непасрэдным навуковым кіраўніцтвам было абаронена дзесяць кандыдацкіх дысертацый, а яшчэ адна дысертацыя была абаронена пасля сыходу з жыцця Паўла Алегавіча. Пры гэтым шэраг прац было прысвечана менавіта палітычнай гісторыі ВКЛ, у іх так ці інакш закраналася парламентарская тэматыка [16, с. 115; 26–27]. Больш за тое, праз сваіх вучняў П. А. Лойка змог развіць шэраг навуковых праблем. Так, праблематыку лакальных прадстаўнічых інстытутаў улады на тэрыторыі Полаччыны закранаў Васіль Аляксеевіч Варонін [29, арк. 77; 30–31]. Падчас сваёй працы на кафедры В. А. Варонін удзельчаў у міжнародным археаграфічным праекце па выданні полацкіх грамат, у якім былі прадстаўлены дакументы і па соймавай праблематыцы [32–33]. Пытаннямі палітычнага развіцця полацкай шляхты і ВКЛ увогуле ў эпоху дынастыі Вазаў займаецца Віталь Уладзіміравіч Галубовіч, які ў свой час пісаў дысертацыю пад кіраўніцтвам П. А. Лойкі [34–36]. У рэчышчы барацьбы магнацкіх груповак тэматыку парламентарызму закранаў Генадзь Віктаравіч Прыбытка [37]. У кантэксце праблемы вялікакняжацкай улады ў структуры органаў дзяржаўнага кіравання ВКЛ у канцы XIV – пачатку XVI ст. прасочваюцца парламетарскія сюжэты ў дысертацыі Віктара Васільевіча Цішчанкі [38]. Акрамя гэтага, соймавая праблематыка ім была разгледжана ў рэчышчы судовай кампетэнцыі вялікага князя літоўскага ў канцы

XV – першай трэці XVI ст. [39–40]. У кантэксце знешняй палітыкі ВКЛ пытанні парламентарызму разглядаліся ў працах Макара Аляксандравіча Шніпа (пачатак XVI ст.) і Алены Васільеўны Дземідовіч (пачатак XVII ст.) [41–45]. Аднак праблемны падыход да тэматыкі парламентарызму ВКЛ больш характэрны для навуковай дзейнасці Уладзіміра Аляксеевіча Падалінскага [46].

У 2010-я гг. на кафедры адбыліся істотныя змены. Па-першае, гэта звязана з сыходам з жыцця першага яе загадчыка П. А. Лойкі. Па-другое, у гэты час супрацоўнікі кафедры арганізоўваюць шэраг навуковых мерапрыемстваў па гісторыі і гістарыяграфіі ВКЛ. Па-трэцяе, выкладчыкамі кафедры сталі выпускнікі мінулых дзесяцігоддзяў: М. А. Шніп, А. У. Любы, У. А. Падалінскі і інш. [6, с. 198–200; 7, с. 423–425]. Ужо пад іх кіраўніцтвам пісаліся навуковыя працы, у якіх так ці інакш закранылася тэматыка парламентарызму ВКЛ. Так, напрыклад, пад навуковым кіраўніцтвам А. У. Любага ў кантэксце сумежных тэм дадзеныя пытанні ў сваіх працах закранылі В. А. Валадковіч і С. А. Ганчарэнка [47–50]. Аднак вялікай праблемай гэтага перыяду было тое, што за паўтара дзесяцігоддзя на кафедры не было абаронена кандыдацкіх дысертацый па палітычнай гісторыі Вялікага Княства, за выключэннем працы А. В. Дземідовіч [43]. Пры гэтым былі падрыхтаваны дысертацыі, прысвечаныя наватарскім праблемам гісторыі ВКЛ, якія адпавядаюць сучасным тэндэнцыям сусветнай гістарычнай навукі (Д. В. Скварчэўскі, Н. В. Стахно) [51–52].

Нягледзячы на гэта, праблематыку парламентарызму ВКЛ на новы ўзровень узняў У. А. Падалінскі, які займаў пасаду загадчыка кафедры з 2017 па 2023 г. Навукоўцам распрацоўваюцца праблемы соймавага прадстаўніцтва, дзейнасці асобных соймаў (асабліва Люблінскага сойма 1569 г.), прававаой і палітычнай культуры, палітычнай эліты, парламентарскіх традыцый ВКЛ у апошняй трэці XVI ст. і інш. [53–61]. У 2017 г. выйшла з друку манаграфія У. А. Падалінскага «Прадстаўніцтва Вялікага Княства Літоўскага на Люблінскім сойме 1569 года: удзел у працы першага вальнага сойма Рэчы Паспалітай». У ёй упершыню ў беларускай гістарыяграфіі комплексна рэканструявалася праца вальнага сойма 2 ліпеня – 12 жніўня 1569 г. Гісторыкам была разгледжана дзейнасць дэлегацыі ВКЛ у пытаннях вызначэння дзяржаўна-прававога статуса Вялікага Княства ў складзе Рэчы Паспалітай, забеспячэння абароны, а таксама ў вырашэнні мясцовых і персанальных спраў [62, с. 19–124]. Акрамя гэтага, быў вызначаны персанальны склад сенатараў і земскіх паслоў ВКЛ на Люблінскім пасяджэнні [62, с. 125–196, 201–207]. Дадзеная праца атрымала высокую адзнаку рэцэнзентаў [63]. Спалучэнне навуковай зацікаўленасці і выкладчыцкай дзейнасці У. А. Падалінскага дазволіла яму стварыць і выкладаць спецыяльны курс «Эвалюцыя парламенцкай сістэмы Вялікага Княства Літоўскага ў XIV–XVIII стст.» [64].

Вылучэнне гісторыі парламентарызму ВКЛ як асобнай праблемы паўплывала і на навуковую дзейнасць студэнтаў і магістрантаў кафедры.

Традыцыйна соймавая праблематыка прысутнічае ў навуковых дакладах, студэнцкіх публікацыях, дыпломных працах і магістарскіх дысертацыях.

Такім чынам, кафедра гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў БДУ з'яўляецца адзінай у Рэспубліцы Беларусь вузкаспецыялізаванай структурай, якая дазваляе атрымаць вышэйную адукацыю ў галіне айчыннай ВКЛістыкі на ўсіх узроўнях (бакалаўрыят, магістратура, аспірантура, дактарантура). Традыцыі вывучэння праблематыкі парламентарызму ВКЛ на кафедры заклаў першы яе загадчык П. А. Лойка ў 1990–2000-я гг. Акрамя гэтага, ён здолеў сфарміраваць персанальную навуковую школу. Яе прадстаўнікі разглядалі пытанні парламентарызму як асобную праблему, так і ў сувязі з іншымі тэмамі. Навуковая і выкладчыцкая дзейнасць П. А. Лойкі паўплывалі на даследаванні шэрагу супрацоўнікаў (а калісьці студэнтаў) кафедры, якія не заўсёды былі звязаны з ім навуковым кіраўніцтвам. Ужо на працягу 2010-х – пачатку 2020-х гг. трэнд на вывучэнне гісторыі парламентарызму ВКЛ развіў У. А. Падалінскі, які здолеў узняць гэтую тэму на новы навуковы ўзровень. Кафедра гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў БДУ за апошнія трыццаць гадоў стала сапраўдным навуковым цэнтрам вывучэння як гісторыі ВКЛ у цэлым, так і гісторыі парламентарызму ў прыватнасці.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Довматович, К. Д.* Сейм Великого Княжества Литовского в историографии Восточной Европы конца XIX – первой половины XX в. / К. Д. Довматович // Научные труды Республиканского института высшей школы. Исторические и психолого-педагогические науки: сб. науч. ст. – Минск: РИВШ, 2023. – Вып. 23, ч. 1. – С. 48–56.

2. *Доўнар-Запольскі, М. В.* Гісторыя Беларусі / М. В. Доўнар-Запольскі; Беларус. Энцыкл., Нац. архіў Рэсп. Беларусь; пер. з рус. Т. М. Бутэвіч [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 1994. – 510 с.

3. *Ігнатоўскі, У. М.* Кароткі нарыс гісторыі Беларусі / У. М. Ігнатоўскі; уступ. арт. А. П. Грыцкевіча; кам. і заўв. Э. Н. Гнеўкі. – 5-е выд. – Мінск: Беларусь, 1992. – 190 с.

4. *Пічэта, У.* Гісторыя Беларусі: частка першая / У. Пічэта. – Масква – Ленінград: Дзяржаўнае выдавецтва, 1924. – 134 с.

5. *Біч, М. В.* Аб нацыянальнай канцэпцыі гісторыі і гістарычнай адукацыі / М. В. Біч // Беларускі гістарычны часопіс. – 1993. – № 1. – С. 15–24.

6. *Любы, А. Ул.* Апошнія дваццаць пяць год гісторыі Вялікага Княства Літоўскага ў Беларускім дзяржаўным ўніверсітэце / А. Ул. Любы // Studia Historica Europae Orientales – Исследования по истории Восточной Европы. – 2019. – Т. 12. – С. 197–202.

7. *Любы, А. Ул.* Беларуская гістарыяграфія Вялікага Княства Літоўскага на мяжы XX і XXI ст.: да 25-годдзя кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта / А. Ул. Любы // Przegląd Środkowo-Wschodni. – 2020. – № 5. – S. 421–426.

8. *Лойка, П. А.* Палітычныя адносіны ў Вялікім княстве Літоўскім / П. А. Лойка // Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. / М. П. Касцюк [і інш.]. – Мінск: Беларусь, 1994. – Ч. 1. – С. 114–139.

9. *Емяльянчык, У. П.* Палітычнае становішча. Канец Рэчы Паспалітай / У. П. Емяльянчык, П. А. Лойка // Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. / М. П. Касцюк [і інш.]. – Мінск: Беларусь, 1994. – С. 228–242.

10. *Емельянчык, У.* Паланэз для касінераў: (З падзей паўстання 1794 г. пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі на Беларусі) / У. Емельянчык. – Мінск: Беларусь, 1994. – 160 с.

11. *Жылуновіч, Л. А.* Рэц. на кн.: У. Емельянчык. Паланез для касінераў: (З падзей паўстання 1794 г. пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі на Беларусі) / У. Емельянчык. – Мінск: Беларусь, 1994. – 160 с. / Л. А. Жылуновіч, Ю. Л. Казакоў, У. А. Сосна // Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Сер. 3. Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Права. – Мінск: Універсітэцкае, 1998. – № 1. – С. 79–80.

12. *Лойка, П.* Органы саслоўнага прадстаўніцтва і ўлады / П. Лойка // Гісторыя Беларусі: у 6 т. / Ю. Бохан [і інш.]. – Мінск: Экаперспектыва, 2008. – Т. 2. – С. 380–387.

13. *Емельянчык, У.* Грамадзянская вайна ў Вялікім княстве Літоўскім (1696–1700 гг.) / У. Емельянчык // Гісторыя Беларусі: у 6 т. / Ю. Бохан [і інш.]. – Мінск: Экаперспектыва, 2007. – Т. 3. – С. 93–104.

14. *Емельянчык, У.* Глава 2. Грамадска-палітычнае жыццё. Раздзел 3. Беларусь у другой палове XVIII ст. / У. Емельянчык // Гісторыя Беларусі: у 6 т. / Ю. Бохан [і інш.]. – Мінск: Экаперспектыва, 2007. – Т. 3. – С. 209–259.

15. Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego. Spisy, tom I: Województwo wileńskie. XIV–XVIII wiek / Andrzej Rachuba (red.); Uładzimir Jamialjanczyk, Henryk Lulewicz, Przemysław P. Romaniuk. – Warszawa: DiG, 2004.

16. *Падалінскі, У. А.* Гісторыя Беларусі перыяду Сярэднявечча і ранняга Новага часу ў даследаваннях Паўла Лойкі (1958–2010) / У. А. Падалінскі, А. Р. Дзянісава // Журнал Белорусского государственного университета. История. – 2018. – № 3. – С. 110–119.

17. *Голубеў, В. Ф.* Памяці сябра, Паўла Алегавіча Лойкі / В. Ф. Голубеў // Беларускі гістарычны часопіс: навукова-тэарэтычны, навукова-метадычны часопіс. – 2011. – № 9. – С. 37–41.

18. *Казакоў, Ю. Л.* Павел Алегавіч Лойка / Ю. Л. Казакоў, А. Г. Каханоўскі, С. М. Ходзін // Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Сер. 3. Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Права. – 2011. – № 1. – С. 115.

19. *Лойка, П. А.* Афармленне шляхецкага саслоўя ў Вялікім княстве Літоўскім / П. А. Лойка // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навук. зб. / рэдкал.: У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БДУ, 2010. – Вып. 5. – С. 102–115.

20. *Лойка, П. А.* Гістарыяграфія праблемы вывучэння ролі шляхты ў грамадска-палітычным жыцці Рэчы Паспалітай (другая палова XVI – першая трэць XVII ст.) / П. А. Лойка // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навук. зб. / рэдкал.: У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінкк: БДУ, 2008. – Вып. 3. – С. 46–52.

21. *Лойка, П. А.* Міжсаслоўныя стасункі ў беларускім грамадстве (XVI – першая палова XVII ст.) / П. А. Лойка // XXI век: актуальные проблемы исторической науки: материалы междунар. науч. конф., посвящ. 70-летию ист. фак. БГУ, Минск, 15–16 апр. 2004 г. / редкол.: В. Н. Сидорцов (отв. ред.) [и др.]. – Минск: БГУ, 2004. – С. 207–209.

22. *Лойка, П. А.* Рэалізацыя акта Люблінскага сойма 1569 г. у гістарычнай рэчаіснасці другой паловы XVI – пачатку XVII ст. / П. А. Лойка // Выбраныя навуковыя працы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта: у 7 т. Т. 2. Гісторыя. Філалогія. Журналістыка / адк. рэд. А. А. Яноўскі. – Мінск: БДУ, 2001. – С. 52–64.

23. *Лойка, П. А.* Сфера палітычных інтарэсаў шляхты беларускіх зямель у апошняй трэці XVI – першай трэці XVII ст. / П. А. Лойка // Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Серыя 3. Гісторыя. Філасофія. Псіхалогія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Права. – Мінск: Універсітэцкае, 2000. – № 1. – С. 3–7.

24. *Лойка, П. А.* Узаемадзеянне шляхецкага і мяшчанскага саслоўяў на беларускіх землях у другой палове XVI – першай палове XVII ст. / П. А. Лойка // Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Сер. 3. Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Права. – 2009. – № 3. – С. 3–8.

25. *Лойка, П.* Соймікі беларускіх зямель у дзяржаўна-палітычным жыцці Рэчы Паспалітай (апошняя трэць XVI – першая трэць XVII ст.) / П. Лойка // Парламенцкія структуры ўлады ў сістэме дзяржаўнага кіравання Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай у XV–XVIII стагоддзях: матэрыялы міжнар. навук. канф. (Мінск – Наваградак, 23–24 ліст. 2007 г.) / навук. рэд.: С. Ф. Сокал, А. М. Янушкевіч. – Мінск: БІП-С Плюс, 2008. – С. 176–182.

26. *Сосна, У. А.* Памяці гісторыка-медыявіста Паўла Алегавіча Лойкі (12.07.1958–22.10.2010). Беларускія сяляне і шляхта ў даследаваннях Паўла Лойкі / У. А. Сосна // Studia Historica Europae Orientalis = Исследования по истории Восточной Европы: науч. сб. – Минск: РИВШ, 2010. – Вып. 3.

27. *Сосна, У. А.* Палітычная гісторыя познефеадальнай Беларусі ў працах выкладчыкаў кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў БДУ: традыцыя і сучаснасць / У. А. Сосна // Studia Historica Europae Orientalis = Исследования по истории Восточной Европы: науч. сб. – Минск: РИВШ, 2014. – Вып. 7. – С. 231–244.

28. *Лойка, П. А.* Шляхта беларускіх зямель у грамадска-палітычным жыцці Рэчы Паспалітай у другой палове XVI – першай трэці XVII ст. / П. А. Лойка. – Мінск: БДУ, 2002. – 99 с.

29. *Варонін, В. А.* Сацыяльна-эканамічнае і палітычные развіццё Полацкага ваяводства ў першай палове XVI стагоддзя: дыс. … канд. гіст. навук: 07.00.02 / В. А. Варонін. – Мінск, 2000. – 110 арк.

30. *Варонін, В.* Заканатворчая дзейнасць віцебскіх абласных з’ездаў у першай палове XVI ст. (на прыкладзе ўстаў аб «пахожых» сялянах 1531 і 1551 гг.) / В. Варонін // Парламенцкія структуры ўлады ў сістэме дзяржаўнага кіравання Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай у XV–XVIII стагоддзях: матэрыялы міжнар. навук. канф. (Мінск – Наваградак, 23–24 ліст. 2007 г.) / навук. рэд.: С. Ф. Сокал, А. М. Янушкевіч. – Мінск: БІП-С Плюс, 2008. – С. 55–60.

31. *Варонін, В.* Палітычны лад Полацкага ваяводства ў першай палове XVI ст. / В. Варонін // Беларускі гістарычны агляд: навуковы часопіс. – 1998. – Т. 5, сш. 1 (8). – С. 27–66.

32. Полоцкие грамоты XIII – начала XVI в. Т. I / А. Л. Хорошкевич (отв. ред.) [и др.]. – М.: Русский фонд содействия образованию и науке, 2015. – 864 с.

33. Полоцкие грамоты XIII – начала XVI в. Т. II / А. Л. Хорошкевич (отв. ред.) [и др.]. – М.: Русский фонд содействия образованию и науке, 2015. – 524 с.

34. *Галубовіч, В.* Прадстаўніцтва ад Вялікага княства Літоўскага на соймах Рэчы Паспалітай падчас праўлення Уладзіслава Вазы (1633–1648 гг.) / В. Галубовіч // Парламенцкія структуры ўлады ў сістэме дзяржаўнага кіравання Вялікага княства

Літоўскага і Рэчы Паспалітай у XV–XVIII стагоддзях: матэрыялы міжнар. навук. канф. (Мінск – Наваградак, 23–24 ліст. 2007 г.) / навук. рэд.: С. Ф. Сокал, А. М. Янушкевіч. – Мінск: БІП-С Плюс, 2008. – С. 260–267.

35. *Галубовіч, В. У.* Кнігі запісаў Метрыкі Вялікага Княства Літоўскага за час праўлення Уладзіслава IV Вазы як крыніца па гісторыі Беларусі: аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук: 07.00.09 / В. У. Галубовіч. – Мінск, 2003. – 20 с.

36. *Галубовіч, В. У.* Полацкая шляхта ў час праўлення дынастыі Вазаў: 1588–1668 гг.: манаграфія / В. У. Галубовіч. – Гродна: ГДАУ, 2015. – 242 с.

37. *Прыбытка, Г. В.* Барацьба магнацкіх груповак у Вялікім Княстве Літоўскім у сярэдзіне XVII ст. (1655–1668 гг.): аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук: 07.00.02; 07.00.03 / Г. В. Прыбытка. – Мінск, 2000. – 18 с.

38. *Цішчанка, В. В.* Вялікакняжацкая ўлада ў структуры органаў дзяржаўнага кіравання ВКЛ у канцы XIV – пачатку XVI ст.: дыс. … канд. гіст. навук: 07.00.02 / В. В. Цішчанка. – Мінск, 2006. – 120 арк.

39. *Цішчанка, В. В.* Вялікі князь літоўскі як суддзя ў 1492–1529 гг. (Практычны і юрыдычны аспекты дзейнасці) / В. В. Цішчанка // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навук. зб. / рэдкал.: У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БДУ, 2008. – Вып. 3. – С. 65–73.

40. *Цішчанка, В. В.* Аспекты адміністрацыйна-маёмаснай і судовай практыкі вялікіх князёў у Вялікім княстве Літоўскім (канец XV – першая трэць XVI ст.) / В. В. Цішчанка // Studia historica Europae Orientalis = Исследования по истории Восточной Европы: науч. сб. – Минск: РИВШ, 2009. – Вып. 2. – С. 123–135.

41. *Дземідовіч, А. В.* Адлюстраванне адносін шляхты Вялікага княства Літоўскага да вайны Рэчы Паспалітай з Расіяй у соймікавых інструкцыях (першая трэць XVII ст.) / А. В. Дземідовіч // Беларусь в современном мире: материалы III Междунар. науч. конф. студентов, магистрантов и аспирантов, Гомель, 20 мая 2010 г. / Гомел. гос. техн. ун-т; редкол.: В. В. Кириенко (гл. ред.) [и др.]. – Гомель, 2010. – С. 164–166.

42. *Дземідовіч, А. В.* Адносіны Вялікага княства Літоўскага са Шведскім каралеўствам у канцы XVI – пачатку XVII ст. у святле рашэнняў Люблінскага сойма 1569 г. / А. В. Дземідовіч // Studia Historica Europae Orientalis: науч. сб. / Респ. ин-т высш. шк.; отв. ред.: А. В. Мартынюк, Г. Я. Голенченко. – Минск, 2008. – Вып. 1. – С. 132–140.

43. *Дземідовіч, А. В.* Вялікае княства Літоўскае ў знешнепалітычных адносінах Рэчы Паспалітай з Расіяй і Швецыяй у першай трэці XVII ст.: аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук: 07.00.15 / А. В. Дземідовіч. – Мінск, 2012. – 22 с.

44. *Шніп, М. А.* Пытанне уніі ў стасунках Вялікага княства Літоўскага і Польскага каралеўства ў пачатку XVI ст. / М. А. Шніп // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навук. зб. / рэдкал.: У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.] – Мінск: БДУ, 2007. – Вып. 2. – С. 163–166.

45. *Шніп, М. А.* Унутрыпалітычны канфлікт 1508 года ў Вялікім княстве Літоўскім у кантэксце міжнародных адносін ва Усходняй Еўропе: аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук: 07.00.02 / М. А. Шніп. – Мінск, 2009. – 24 с.

46. *Падалінскі, У. А.* Прадстаўніцтва і палітычная пазіцыя Вялікага княства Літоўскага на вальных соймах Рэчы Паспалітай у апошняй трэці XVI ст.: аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук: 07.00.02 / У. А. Падалінскі. – Мінск, 2004. – 22 с.

47. *Валадковіч, В. А.* “Crimea majestatis” (абраза маестата) у прававой сістэме Вялікага Княства Літоўскага XV–XVI стагоддзяў / В. А. Валадковіч // Научные труды Республиканского института высшей школы. Исторические и психолого-педагогические науки: сб. науч. ст. – Минск: РИВШ, 2015. – Вып. 15, ч. 1. – С. 23–31.

48. *Валадковіч, В. А.* Працэдура разгляду судовых спраў на вальных соймах Рэчы Паспалітай у канцы XVI – пачатку XVII ст. / В. А. Валадковіч // Сборник научных статей студентов, магистрантов, аспирантов. Вып. 13: в 2 т. Т. 1 / сост. С. В. Анцух; под общ. ред. В. Г. Шадурского. – Минск: Четыре четверти, 2015. – С. 7–9.

49. *Ганчарэнка, С. А.* Характар канфлікту паміж Крыштофам Радзівілам «Перуном» і Жыгімонтам III Вазаю ў апошнім дзесяцігоддзі XVI – пачатку XVII стагоддзяў / С. А. Ганчарэнка // Сборник работ 70-й научной конференции студентов и аспирантов Белорусского государственного университета, 15–18 мая 2013 г.: в 3 ч. – Минск: БГУ, 2013. – Ч. 2. – С. 312–315.

50. *Ганчарэнка, С. А.* Сенатарскія роды Вялікага Княства Літоўскага ў 1566–1605 гг.: склад і структура / С. А. Ганчарэнка // Studia Historica Europae Orientalis = Исследования по истории Восточной Европы: науч. сб. – Минск: РИВШ, 2017. – Вып. 10. – С. 104–123.

51. *Скварчэўскі, Д. В.* Фарміраванне і развіццё астранамічных ведаў у Вялікім Княстве Літоўскім у XIV–XVII стст.: аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук: 07.00.02 / Д. В. Скварчэўскі. – Мінск, 2016. – 24 с.

52. *Стахно, Н. В.* Танаталагічныя ўяўленні шляхты Вялікага Княства Літоўскага ў канцы XVI – XVIII ст.: аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук: 07.00.02 / Н. В. Стахно. – Мінск, 2019. – 24 с.

53. *Падалінскі, У.* Люблінская унія 1569 г. / У. Падалінскі, Л. Собалева // Гісторыя Беларусі: у 6 т. / Ю. Бохан [і інш.]. – Мінск: Экаперспектыва, 2008. – Т. 2. – С. 457–478.

54. *Падалінскі, У. А.* Вальны сойм Рэчы Паспалітай 1572 г.: эпідэмія, улада і грошы / У. А. Падалінскі // Беларускі гістарычны часопіс. – 2021. – № 6. – С. 3–13.

55. *Падалінскі, У. А.* Галоўны з’езд Вялікага Княства Літоўскага: генезіс, функцыі, гістарычнае развіццё / У. А. Падалінскі // Беларускі гістарычны часопіс. – 2015. – № 1. – С. 13–23.

56. *Падалінскі, У. А.* Партыкулярызм vs уніфікацыя: распрацоўка і прыняцце Статута Вялікага Княства Літоўскага 1588 г. / У. А. Падалінскі // Журнал Белорусского государственного университета. История = Journal of the Belarusian State University. Historical sciences. – 2018. – № 2. – С. 10–20.

57. *Падалінскі, У. А.* Прававая культура шляхты Вялікага Княства Літоўскага ў XVI ст.: казус Яна Осціка / У. А. Падалінскі // Беларускі гістарычны часопіс. – 2020. – № 6. – С. 10–17.

58. *Падалінскі, У. А.* Прадстаўнікі Гарадзенскага павета на соймах Рэчы Паспалітай у апошняй трэці XVI ст. / У. А. Падалінскі // Леў Сапега (1557–1633 гг.) і яго час: зб. навук. арт. – Гродна: ГрДУ імя Я. Купалы, 2007. – С. 32–39.

59. *Падалінскі, У. А.* Стаўленне шляхты Вялікага Княства Літоўскага да інстытута вальнага сойма ў канцы XVI ст. / У. А. Падалінскі // Беларускі гістарычны часопіс. – 2012. – № 8. – С. 15–24.

60. *Падалінскі, У. А.* Ухваленне падаткаў на вальных соймах Рэчы Паспалітай як фактар палітычнай барацьбы (1593–1598 гг.) / У. А. Падалінскі // Сацыяльна-эканамічныя і прававыя даследаванні. – 2009. – № 3. – С. 157–176.

61. *Подолинский, В. А.* Борьба за суверенитет ВКЛ после Люблинской унии / В. А. Подолинский // История белорусской государственности. В 5 т. Т. 1. Белорусская государственность: от истоков до конца XVIII в. / А. А. Коваленя [и др.]; отв. ред. тома: О. Н. Левко, В. Ф. Голубев; Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории. – 2-е изд. – Минск: Беларуская навука, 2019. – С. 384–395.

62. *Падалінскі, У. А.* Прадстаўніцтва Вялікага Княства Літоўскага на Люблінскім сойме 1569 года: удзел у працы першага вальнага сойма Рэчы Паспалітай / У. А. Падалінскі; навук. рэд. А. А. Радаман. – Мінск: А. М. Янушкевіч, 2017. – 240 с.

63. *Галубовіч, В. У.* Рэц. на кн.: Падалінскі, У. А. Прадстаўніцтва Вялікага Княства Літоўскага на Люблінскім сойме 1569 года: удзел у працы першага вальнага сойма Рэчы Паспалітай. – Мінск: А. М. Янушкевіч, 2017. – 240 с. / В. У. Галубовіч // Журнал Белорусского государственного университета. История = Journal of the Belarusian State University. Historical sciences. – 2018. – № 1. – С. 101–103.

64. *Падалінскі, У. А.* Эвалюцыя парламенцкай сістэмы Вялікага Княства Літоўскага ў XIV–XVIII стст.: электронны вучэбна-метадычны комплекс для спецыяльнасці 1-21 03 01 «Гісторыя (па напрамках)», напрамак спецыяльнасці 1-21 03 01-01 «Гісторыя (айчынная і ўсеагульная)» / У. А. Падалінскі; БДУ, Гіс. фак., Каф. гісторыі Беларусі старажыт. часу і сярэд. вякоў. – Мінск: БДУ, 2018. – 48 с. – №007305102018, Деп. в БГУ 05.10.2018.

**(Дата падачы: 23.02.2024 г.)**

*М. Н. Денисов*
Институт истории Национальной академии наук Беларуси, Минск

*M. Denisov*
The Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk

**УДК 001.32(476)(091)“1944/1950”**

## ПРОМЫШЛЕННЫЕ ПРОЕКТЫ АКАДЕМИИ НАУК БССР В УСЛОВИЯХ ВОССТАНОВЛЕНИЯ ЕЕ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ (1944–1950 ГГ.)

## INDUSTRIAL PROJECTS OF THE ACADEMY OF SCIENCES OF THE BSSR IN THE CONDITIONS OF THE RESTORATION OF ITS ACTIVITIES (1944–1950)

*В статье рассмотрены вопросы восстановления Академии наук БССР в период после окончания боевых действий Великой Отечественной войны на территории Беларуси (1944–1950 гг.), определена роль научных исследований АН БССР в сфере промышленности в указанный период, дана краткая характеристика наиболее значимых проектов.*

*Ключевые слова: Академия наук БССР; экономика; промышленность; энергетика; Великая Отечественная война; наука; техника.*

*The article discusses the issues of the restoration of the Academy of Sciences of the BSSR in the period after the end of the hostilities of the Eastern Front (World War II) on the territory of Belarus (1944–1950), the role of scientific research of the Academy in the field of industry*